# IFMC. СУСТРАКАЙЦЕ СВЯТА ГРАЦЫІ

Харэаграфія — своеасаблівы від мастацтва, які спалучае выпрацаванні магчымасцяў і чалавечага цела, і чалавечага розуму. Сучасны танец — не менш канцэптуальная, унікальная і сэнсава напоўненая з'ява, чым любое іншае мастацтва. Упэўніцца ў гэтым змаглі гледачы Міжнароднага фестывалю сучаснай харэаграфіі (IFMC), які 32-гі раз праходзіць у Віцебску. Першыя дзесяць гадоў свайго існавання віцебскі фестываль быў адзіным такім маштабным мерапрыемствам, прысвечаным сучаснаму танцу, на тэрыторыі былога СССР. У гэтым годзе форум наведалі ўдзельнікі з Бельгіі, Германіі, Ізраіля, Іспаніі, Італіі, Літвы, Нідэрландаў, Польшчы, Расіі, Украіны і Францыі.

Падчас адкрыцця старшыня журы — мастацкі кіраўнік тэатра «Кіеў модэрн-балет», харэограф Раду Пакліташ ру — звярнуўся да ўдзельнікаў: «Мы абяцаем адкрыць сэрцы насустрач вашай творчасці. Пакарыце нас!»

А намеснік міністра культуры Беларусі Наталля Карчэўская ў сваім прывітальным слове адзначыла:

— Сёння вялікае свята для гледачоў. Міжнародны фестываль сучаснай харэаграфіі (IFMC) — гэта культурны брэнд Беларусі. Мы робім усё, каб нашу краіну, харэаграфічнае мастацтва ведалі ва ўсім свеце.

Асаблівасцю сёлетняй цырымоніі адкрыцця стала тое, што яна абышлася без прадстаўлення калектываў-удзельнікаў. У першы дзень мерапрыемства адбылася прэзентацыя фотапраекта Ігара Гусакова і выстаўкі скульптур Сяргея Сотнікава «На краі сусвету».

Сёлета ў межах фестывалю праходзіў і конкурс беларускай харэаграфіі, які праводзіцца раз на два гады: чаргуецца з міжнародным. З 34 калектываў-удзельнікаў да фіналу дайшлі 25, сярод якіх чатыры з Віцебска: праект «*Renovation*», калектыў сучаснай харэаграфіі «МаКраСвет», тэатр-студыя сучаснай харэаграфіі Дзіяны Юрчанкі і школа танца «Менада». Фінал конкурсу адбудзецца 22 лістапада.

Сапраўдным святам для гледачоў стаў пластычны спектакль «Ганна Карэніна» на музыку Альфрэда Шнітке, які прадставілі артысты Маскоўскага дзяржаўнага акадэмічнага тэатра імя Вахтангава. На мову танца вядомы раман Льва Талстога пераклала літоўскі рэжысёр Анжаліка Холіна.

Акрамя яго, у праграме фестывалю было паказана яшчэ пяць разнастайных харэаграфічных пастановак. Балет «Вій» па матывах аповесці Мікалая Гогаля ў інтэрпрэтацыі рэжысёра Раду Паклітару прадставілі ў Беларусі двойчы: 19 лістапада — у Віцебску і 20 лістапада — на сцэне Вялікага тэатра оперы і балета ў Мінску. Парыльны дуэт «*Sweat baby sweat*», пастаўлены бельгійскім рэжысёрам Янам Марцэнсам, заснаваны на розных мовах руху: буто, ёга, цыркавая акрабатыка, рок-н-рол. Яго можна было ўбачыць на сцэне Абласной філармоніі ў Віцебску 20 лістапада. Тэатр «Балет Яўгенія Панфілава» прадставіў адразу дзве аднаактовыя пастаноўкі: «Лабірынт», часткова заснаваны на апавяданні Эдгара Алана По «Маска чырвонай смерці», але са своеасаблівай сюжэтнай лініяй, створанай рэжысёрам Аляксеем Растаргуевым, і «Чалавек паветра» — спектакль з цыкла «Літаратурны курс», натхнёны творчасцю Рэнэ Магрыта. Спектаклі суправаджалі этапы фіналу беларускага конкурсу харэаграфіі.



Фота БелТА

*Выступае майстэрня сучаснага танца Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта культуры і мастацтваў пад кіраўніцтвам Міхаіла Камінскага.*

На ўрачыстым закрыцці форуму 23 лістапада будуць аб'яўлены пераможцы конкурсу, а пасля гледачоў чакае сапраўдны падарунак: «*Oskara*» — найлепшы спектакль міжнароднага форуму танца *Tanzmesse-2018* у Дзюсельдорфе. Яго прадставіць іспанская кампанія танца *Kukai Dantza*.

**Дар'я СМІРНОВА**

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ